ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
23
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 3 (1489)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## НАРАДА Ў ЦК КПСС

У ЦК КПСС адбылася нарада сакратароў ЦК кампартый і міністраў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі саюзных рэспублік па пытаннях удасканалення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў святле рашэнняў красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС.

Нараду ўступным словам адкрыў член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС Я. К. Лігачоў.

Па абмеркаванаму пытанню выступілі: сакратар ЦК Кампартыі Грузіі Г. Н. Енукідзе, сакратар ЦК Кампартыі Літвы Л. К. Шэпеціс, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК Кампартыі Украіны Ф. М. Рудзіч, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Казахскай ССР К. Н. Нарыбаеў, першы намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі РСФСР Е. І. Казанцаў, рэктар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава А. А. Лагуноў, рэктар сельскагаспадарчай акадэміі імя К. А. Ціміразева М. І. Сінюкоў, рэктар Ленінградскага політэхнічнага інстытута імя М. І. Калініна Ю. С. Васільеў.

На нарадзе было падкрэслена, што вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя павінна адыгрываць усёўзрастаючую ролю як фактара даўгачаснага, стратэгічнага ўздзеяння на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, удасканаленне грамадскіх адносін. Як адзначыў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў, перавод вытворчасці на якасна новую тэхнічную аснову прад'яўляе больш высокія патрабаванні да ведаў, кваліфікацыі кадраў. У сувязі з гэтым наспела неабходнасць сур'ёзнай перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Удзельнікі нарады ўказвалі, што перабудова павінна ахопліваць усе бакі жыцця вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы ў святле тых складаных і адказных задач, якія ставіць партыя ў бліжэйшай і працяглай перспектыве. Вырашаць наспеўшыя праблемы неабходна комплексна, усебакова: палепшыць структуру і якасць падрыхтоўкі кадраў, ажыццявіць удасканаленне зместу адукацыі, забяспечыць развіццё творчых здольнасцей спецыялістаў, узняць узровень навукова-педагагічных кадраў, правесці пераснашчэнне вучэбна-матэрыяльнай базы. Вялікая ўвага была ўдзелена далейшаму паляпшэнню выкладання марксісцка-ленінскай тэорыі, узмацненню ідэйна-выхаваўчай работы з навучэнцамі, павышэнню іх адказнасці за вынікі навучальнай працы, развіццю студэнцкага самакіравання.

Адзначалася, што перабудову вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы, павышэнне эфектыўнасці сістэмы перападрыхтоўкі і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў, паляпшэнне іх выкарыстання, узмацненне інтэграцыі ВНУ, навукі і вытворчасці трэба разглядаць як неадкладную задачу нашага грамадскага развіцця.

У рабоце нарады прынялі ўдзел член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР Г. А. Аліеў, сакратар ЦК КПСС М. В. Зімянін, загадчык Аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПСС В. А. Мядзведзеў, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Г. А. Ягадзін, міністр асветы СССР С. Г. Шчарбакоў, міністр аховы здароўя СССР С. П. Буранкоў, старшыня Дзяржкампрацы СССР І. І. Гладкі.

(ТАСС).

Беларускі універсітэт

### ТЭЛЕТАЙП

«Учора · Сёння · Заўтра»

### З 23 СТУДЗЕНЯ

па 23 лютага ў азнаменаванне 68-гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту праводзіцца Усесаюзны месячнік абаронна-масавай работы.

Ва універсітэце з 29 студзеня па 12 лютага адбудзецца Зорны паход па месцах баявой, рэвалюцыйнай і працоўнай славы савецкага народа. У ім прымуць удзел 14 груп.

А. МАЛЯРЭВІЧ,
намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце.

### У «ГАУДЭАМУСЕ»

адбылася сустрэча камсамольскага актыву універсітэта з членам Галоўнага праўлення таварыства польска-савецкай дружбы, брыгадным генералам у адстаўцы, супрацоўнікам Акадэміі навук ПНР Т. С. Дамбкоўскім. Ён расказаў прысутным аб сучасным становішчы ў Польшчы, яе ўнутранай і знешняй палітыцы, аб рабоце маладзёжных арганізацый рэспублікі, адказаў на шматлікія пытанні камсамольцаў.

С. СЯРГЕЕЎ,
сакратар камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў.

### ПАЧАЛАСЯ ПАДРЫХТОЎКА

да правядзення навукова-практычнай канферэнцыі «XXVII з'езд КПСС і задачы універсітэта па падрыхтоўцы спецыялістаў». Створаны арганізацыйны камітэт на чале з рэктарам. У рабоце канферэнцыі прымуць удзел усе факультэты. Выступленні з канферэнцыі будуць надрукаваны ў вучэбнай газеце «Журналіст».

А. ВІХРОВА.

### НА ПРЭЗІДЫУМЕ

прафкома супрацоўнікаў абмеркаваны ход падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж падраздзяленнямі за 1985 год. Адобраны праект сацыялістычных абавязацельстваў калектыву універсітэта на 1986 год. Прынята рашэнне аб скліканні канферэнцыі працоўных калектываў універсітэта ў першай палове лютага.

В. ЮРЧАНКА.

### СА СПРАВАЗДАЧНЫМІ КАНЦЭРТАМІ

выступілі лаўрэаты Усесаюзнага конкурсу самадзейнай мастацкай творчасці, удзельнікі культурнай праграмы XII Сусветнага фестывалю «Неруш» — у Палацы культуры аўтазавода, у Палацы культуры тонкасуконнага камбіната — народны хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

*РАЎНЕННЕ — НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!*

*Алег ДЫШЛЕВІЧ:*

## «ВЕДЫ — МЭТА, ВУЧОБА — НЕАБХОДНАСЦЬ».



ЯШЧЭ на падрыхтоўчым аддзяленні юнак прыцягнуў да сябе ўвагу сваіх таварышаў па вучобе тым, што да кожнай справы адносіўся як да самай патрэбнай у гэты момант. Відаць, таму сёння студэнт IV курса філалагічнага факультэта беларускага аддзялення Алег Дышлевіч карыстаецца павагай і аўтарытэтам у студэнтаў і выкладчыкаў факультэта.

Алег перакладае на родную мову з польскай і украінскай. Піша вершы і апавяданні. У яго ёсць публікацыі ў перыядычным друку.

Камуніст, сакратар камсамольскай арганізацыі групы, Алег Дышлевіч вучыцца толькі на «добра» і «выдатна». Сёння для яго вучоба — галоўная справа, аснова будучай літаратурнай дзейнасці.

*Фота і тэкст А. ВАЛОШЫНА.*

*МІТЫНГІ*

## У імя жыцця на планеце

*НА ПРАХОДЗЯЧЫХ ва універсітэце мітынгах выкладчыкі, студэнты і супрацоўнікі горача падтрымліваюць праграму поўнай і паўсюднай ліквідацыі ядзернай і хімічнай зброі, выкладзеную ў Заяве Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова.*

*На мітынгах у Навукова-даследчым інстытуце фізіка-хімічных праблем, спецыяльным канструктарска-тэхналагічным бюро, на біялагічным, філалагічным і падрыхтоўчым факультэтах выступаючыя падкрэслівалі, што новыя савецкія знешнепалітычныя ініцыятывы зразумелыя і блізкія кожнаму савецкаму чалавеку. Ваенна-прамысловы комплекс у краінах капіталу перамолвае мільярды долараў, ствараюцца ўсё больш дасканалыя сродкі знішчэння людзей. Кіруючыя колы ЗША спрабуюць ператварыць у арэну ваеннага процістаяння нават касмічную прастору. Але народы ўсёй зямлі спадзяюцца, што арсеналы назапашаных узбраенняў урэшце будуць знішчаны. За гэта трэба змагацца, стваральнай працай умацоўваць мір.*

*У прынятых рэзалюцыях мітынгаў выказана падтрымка курсу КПСС у барацьбе за мір і сацыяльны прагрэс.*

*Н. КАЗЕМ,*
*М. НАДЭР,*
*студэнты факультэта журналістыкі.*

*НАШЫ ІНТЭРВ'Ю*

## ЦІХА! ІДЗЕ СЕСІЯ...

**Подых сесіі адчуваецца ўсюды. Студэнту даводзіцца зараз чуць такое звыклае, без прывітання: «Як экзамен? Малайцом!» або «Ды не перажывай ты! Не першы такі і не апошні! З другога заходу атрымаеш, не прымай так блізка да сэрца!»**

**«Як справы? Як сесія?» — гэтыя ж пытанні задалі розным студэнтам універсітэта будучыя журналісты Алена КРУПІЦА і Жанна МІРОНАВА.**

**У адказ яны пачулі...**

**Валянціна Каршукевіч, першакурсніца ФПМ:**

— Што яна прынясе мне, яшчэ не ўяўляю, але спадзяюся на свае веды. Першая сесія — гэта, вядома, і хваляванне (а раптам з першага разу не паставяць?..), і няўпэўненасць (універсітэт, а не школа), і мары (вось, каб усё на «выдатна»!). Галоўнае, лічу, экзамены расставяць усе кропкі над «і».

**Марына Сталбова і Іра Масціцынка, студэнткі біялагічнага факультэта:**

— Дома лепш рыхтавацца. У перапынку, напрыклад, і кніга любімая пад рукой, і тэлевізар...

**Эдуард Мігай, студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі:**

— У нас было ўжо 5 залікаў. Два з іх прыйшлося атрымаць з другога разу. Значыць, не дагледзеў нешта, не давучыў. Таму да першага экзамена рыхтаваўся больш сур'ёзна. Нават з кватэры перайшоў у інтэрнат да сяброў: калі не ведаеш чаго — падкажуць, ды разам і вучыцца лягчэй.

**Тамара Яцыневіч, студэнтка факультэта радыёфізікі і электронікі:**

— Рыхтуюся па вечарах і ў асноўным усё вывучыла. А цяпер вось лічу, што трэба паўтарыць, прайсціся «вярхамі» па галоўнаму.

**Юра Стральцоў, студэнт таго ж факультэта:**

— Рыхтаваўся да сесіі не ў апошнія дні, а на працягу семестра. У апошнія дні не паспееш ахапіць усе гэтыя формулы і метады рашэнняў, доказы і нават тэрміны. Перад сесіяй, на маю думку, трэба добра выспацца, хаця нават у сне можна бачыць формулы, формулы і яшчэ раз формулы.

**Юра папрасіў прабачэння, адкрыў падручнік і ў сто першы раз, як жартуюць сябры, пачаў правяраць сябе ў гэтых формулах. Не дзіўна, што ён бачыць іх, калі спіць.**

(Заканчэнне на 3-й стар.).

## ПРАЕКТЫ ЦК КПСС: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

# ВЫХОЎВАЦЬ ІДЭЙНУЮ ПЕРАКАНАНАСЦЬ

«Творча развіваючы марксізм-ленінізм, КПСС рашуча змагаецца супраць любых праяўленняў рэвізіянізму і дагматызму, глыбока чужых рэвалюцыйнай тэорыі».

*(З праекта Статута Камуністычнай партыі Савецкага Саюза).*

ФАРМІРАВАННЕ ідэйна перакананай, гарманічна развітой асобы будаўніка камуністычнага грамадства, выпрацоўка ў яе актыўнай жыццёвай пазіцыі немагчымы ў сучасных умовах без выхавання ў кожнага савецкага чалавека, юнака, дзяўчыны ваяўнічай класавай непрымірымасці да чужой ідэалогіі. Гэта задача вырашаецца рознымі напрамкамі, сродкамі і формамі палітыка-выхаваўчай, ідэалагічнай работы Камуністычнай партыі, Савецкай дзяржавы, грамадскіх арганізацый, сродкамі масавай інфармацыі і прапаганды.

Сучасная ідэалагічная барацьба, яе асаблівасці вызначаюцца пераходным характарам нашага часу, проціборствам паміж сацыялізмам і капіталізмам, паміж сіламі прагрэсу і рэакцыі. У сувязі з тым, што размова ідзе аб ліквідацыі эксплуататарскага грамадства і замены яго новым, без нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту, барацьба дзвюх супрацьлеглых сістэм набыла буйныя маштабы.

Заканамернасць гэтага працэсу такая, што чым шырэй разгортваецца ў свеце рэвалюцыйны працэс, чым больш відавочныя поспехі сацыялізму, тым больш супраціўленне імперыялізму, вастрыня класавай барацьбы, якая прымае ўсё больш бескампрамісную форму. На XXVI з'ездзе КПСС адзначалася, што ў барацьбе двух светапоглядаў не можа быць месца кампрамісам. Тут патрэбны высокая палітычная пільнасць, актыўная, аператыўная і пераканаўчая прапагандысцкая праца, своечасовы адпор ідэалагічным дыверсіям.

Адной з асаблівасцей ідэалагічнай барацьбы з'яўляецца выкарыстанне імперыялізмам магутных сучасных тэхнічных сродкаў, усіх інструментаў, якія знаходзяцца ў распараджэнні ідэолагаў буржуазіі — друку, радыё, тэлебачання, велізарнага прапагандысцкага апарату. ЗША, Англія, ФРГ і іншыя капіталістычныя краіны адкрыта фінансуюць падрыўныя цэнтры, каардынуюць іх дзейнасць, праводзяць цэнтралізацыю. Толькі сістэма антыкамуністычнага радыёвяшчання «Голас Амерыкі» мае 115 радыёперадатчыкаў, 60 працэнтаў якіх знаходзяцца за межамі ЗША. Яны вяшчаюць 780 гадзін у тыдзень на 36 мовах свету. Тое ж самае назіраецца ў Англіі, ФРГ і іншых імперыялістычных краінах. Эфір літаральна насычаны ўсялякімі выдумкамі аб жыцці нашай краіны, брацкіх краін сацыялізму. Заходняя прапаганда пры дапамозе самых удасканаленых метадаў імкнецца атруціць свядомасць савецкіх людзей паклёпам на нашу рэчаіснасць, ачарніць сацыялізм, упрыгожыць імперыялізм, яго драпежніцкую, бесчалавечную палітыку і практыку, Скажоная інфармацыя і тэндэнцыйнае асвятленне фактаў, замоўчванне, паўпраўда і проста нахабны паклёп — усё пускаецца ў ход.

Усё больш вытанчанай становіцца фальсіфікацыя марксісцка-ленінскага вучэння, сацыялістычнага ладу жыцця, унутранай і знешняй палітыкі КПСС. Падаецца гэта пад выглядам аб'ектыўнай інфармацыі. Усё больш шырока прымяняюцца «звышаператыўнасць», тэндэнцыйнае асвятленне фактаў, выкарыстанне паўпраўды з адкрытай хлуснёй. Вось чаму неабходна растлумачваць увесь фальш гэтай хлуслівай прапаганды, у яснай, канкрэтнай і пераканаўчай форме выкрываць яе каварныя метады, несці людзям зямлі праўду аб першай у свеце краіне пераможшага сацыялізму. Пры гэтым заўсёды трэба памятаць, што паслабленне ўвагі да асвятлення актуальных праблем, недастатковая аператыўнасць, пытанні, пакінутыя без адказаў, выгадны толькі нашаму класаваму ворагу.

Вялікае значэнне ў сучасных умовах набывае барацьба з рэвізіяністамі, неатрацкістамі, сіяністамі і нацыяналістамі ўсіх кірункаў. Весці гэту барацьбу трэба паслядоўна, настойліва, бескампрамісна. Адпор апартунізму ўсіх адценняў быў і застаецца адной з галоўных задач марксісцка-ленінскіх партый.

Змест буржуазнай прапаганды — антыкамунізм і антысаветызм, г. зн. імкненне навязваць негатыўныя, варожыя адносіны да камуністычнай ідэалогіі і яе рэальнага ўвасаблення ў СССР і краінах сацыялістычнай садружнасці. Асабліва антысаветчыкамі раздуваецца шуміха вакол надуманага пытання аб «парушэнні ў СССР правоў чалавека». Адсюль міф аб «недэмакратычнасці» савецкага грамадства. Кожны, хто разбіраецца ў міжнародных падзеях сучаснасці, ведае, што буржуазныя ідэолагі і палітыкі клапоцяцца не аб свабодах для савецкіх людзей, а адстойваюць «права» іх агентаў на падрыўную дзейнасць, «свабоду» праводзіць ідэалагічныя дыверсіі ў нашай краіне. Кожны раз апалагеты імперыялізму паднімаюць неверагодную прапагандысцкую шуміху вакол так званых «заяў» адшчапенцаў тыпу Шчаранскага, Букоўскага, Плюшча, Сіняўскага, Сахарава, Салжаніцына, імкнуцца паказаць іх барацьбітамі за справядлівасць і свабоду. На самай справе яны абараняюць ворагаў сацыялізму, адстойваюць «права» ўмешвацца ва ўнутраныя справы нашай краіны і краін сацыялістычнай садружнасці, весці тут адкрыта падрыўную дзейнасць.

БАРАЦЬБА супраць буржуазнай ідэалогіі — гэта не кампанія, а неад'емная састаўная частка работы па фарміраванню ідэйнай перакананасці моладзі. Трэба ўмець распазнаць хлусню ўсялякіх буржуазных «галасоў» і даваць ім належны адпор. Такая задача ставіцца сёння.

Р. БУЛАЦКІ,
прафесар.

# Лічым неабходным...

## ПРАПАНУЮЦЬ КАМУНІСТЫ ЖУРФАКА

— прапануецца некалькі дапоўніць падраздзел праекта Праграмы ў галіне культуры, літаратуры і мастацтва. Другі сказ III абзаца трэба фармуляваць так: «Абавязковую ўмову паспяховага вырашэння гэтых задач партыя бачыць у пастаянным удасканаленні зместу і метадаў культурна-асветніцкай работы, умацаванні яе матэрыяльнай базы, пашырэнні грамадскіх пачаткаў у дзейнасці ўстаноў культуры»;

— прапануецца ўнесці дапаўненне ў адзін з абзацаў IV часткі. Няхай ён будзе гучаць так: «Партыя будзе няўхільна сцвярджаць у дзейнасці ўсіх партыйных і грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў творчы падыход, дзелавітасць, высокую адказнасць і прынцыповасць, выхоўваць уменне аб'ектыўна і самакрытычна ацэньваць дасягнутыя вынікі, рашуча змагацца з недахопамі, уважліва, чула ставіцца да людзей, іх патрэб і клопатаў»;

— варта дадаць у раздзел «Развіццё палітычнай сістэмы савецкага грамадства», дзе гаворыцца аб задачах прафсаюзаў, фразу: «Павысіць дзейснасць арганізатарскай і выхаваўчай работы ў працоўных калектывах»;

— прапануецца ўнесці ў Статут КПСС палажэнне аб тым, што «персанальная справа камуніста павінна разглядацца, як правіла, на адкрытым партыйным сходзе»;

— у пункце «В» параграфа 3 Статута КПСС гаворыцца, што член партыі мае права крытыкаваць на партыйных сходах, канферэнцыях, з'ездах, пленумах камітэтаў любы партыйны орган, любога камуніста, незалежна ад пасады, якую ён займае. Варта пасля слоў «пленумах камітэтаў» дадаць «і ў партыйным друку».

## СЁННЯ СТУДЭНТ —

ФОТАРЭПАРТАЖ




# Выпрабаванне

ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА — адна з самых цікавых за ўвесь перыяд навучання ў БДУ студэнтаў гістарычнага факультэта. У пяцікурснікаў, што спецыялізуюцца на кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду, яна праходзіла ў сярэдняй школе № 44 г. Мінска.

За кожным практыкантам быў замацаваны клас, дзе ён праводзіў урокі гісторыі і выконваў абавязкі класнага кіраўніка. Мы працавалі з вучн 6, 9, 10-х класаў.

Нас чакала нямала цяжкасцей, але пераадольваць іх было вельмі цікава. Пры падрыхтоўцы да ўрокаў мы імкнуліся ахапіць як мага больш матэрыялу, каб задаволіць цікавасць вучняў.

Зразумела, урокі былі асноўным відам нашай практычнай дзейнасці, але не адзіным. Нашы студэнты займаліся таксама і пазакласнай работай. З энтузіязмам аднесліся і вучні, і практыканты да правядзення «Тыдня гісторыі».

Марыя Кобза і Ларыса Пракаповіч ў 6-х класах падрыхтавалі гістарычную віктарыну, конкурс на лепшы малюнак на гістарычную



## ФЕЛЬЕТОН

# ТАЙНАЯ

ВЯДОМА, што практыка — крытэрый ісціны. Шкада, што гэты грунтоўны закон філасофіі, трывала засвоены ў студэнцкай аўдыторыі, хтосьці трактуе вельмі своеасабліва, імкнучыся на асабістым вопыце праверыць нават тое, што стала даўно прапісной ісцінай, аксіёмай нашага жыцця. Патрэбны прыклады? Калі ласка.

Наўрад ці можна знайсці студэнта, які б усё сваё свядомае жыццё не чуў і не бачыў, што п'янства да дабра не давядзе, які б не ведаў пра сумны лёс тых, хто развітаўся ў апошні час з універсітэтам з-за прыхільнасці да «зялёнага змія». Ведаюць пра гэта ўсе, але аматары праверыць гэтыя ісціны на сваім асабістым вопыце (вельмі потым горкім) яшчэ не перавяліся.

... Адзінаццатага студзеня ў жыцці трох слухачоў падрыхтоўчага аддзялення С. Додзя, А. Панцялеева, І. Хамайко адбыліся вельмі знамянальныя падзеі: здадзены першыя залікі. Гэты дзень два патэнцыяльныя «географы» і адзін «фізік» надумалі адзначыць. Як? Кажучы іх словамі, «вырашылі проста добра павячэраць». І зусім у гэтым нічога не было б дрэннага, каб добрая вячэра ў разуменні далёка не святой троіцы не суадносілася з прыняццем добрай дозы спіртнога.

І вось ужо С. Додзь, праявіўшы ініцыятыву, спяшаецца ў гастраном і вяртаецца з напіткам, які ў народзе трапна празвалі «малачком ад шалёнай кароўкі». Знайшлася і гасцепрымальная гаспадыня, якая паклапацілася аб арганізацыі застолля ў сябе. у пакоі 427 інтэрната № 4. Ею стала студэнтка IV курса філалагічнага факультэта І. Іоннікава. Іменна да яе ў госці і накіраваліся аматары «добра павячэраць». Чаму да яе? Відаць, яны спадзяваліся на вопыт у арганізацыі п'янак, які паспела набыць І. Іоннікава.

Бо не далей, чым у канцы снежня 1985 года, І. Іоннікава ўжо арганізоўвала п'янку ў тым жа інтэрнаце. Гэта стала вядома студсавету і прафсаюзнаму бюро, але чамусьці студэнтка, якая груба пару-

## ЯК ЖЫВЕШ, ІНТЭРНАТ?

# ЦІ ТРЭБА ДЗЯЖУРНЫ?

**Гэтае пытанне хвалюе не толькі адміністрацыю студгарадка, але і студэнтаў. Колькі ні спрачаліся — да адной думкі так і не прыйшлі...**

А ШТО думаюць самі жыхары інтэрнатаў? Як ідуць справы з дзяжурствам на паверхах у суседніх інтэрнатах №№ 2 і 6 па вуліцы Кастрычніцкай?

Калі мы прыйшлі ў інтэрнат № 6, дзе жывуць студэнты ФПМ, адразу заўважылі: на ўсіх паверхах, без выключэння, былі дзяжурныя, панавала чысціня і на калідорах, і на лесвічных пляцоўках, і на кухнях. Няўжо тут за парадкам сочаць толькі прыбіральшчыцы? Усе сумненні былі вырашаны, калі сустрэліся са старшынёй студэнцкага савета Ірынай Баравік. Безумоўна, нашым пытаннем было:

— Якім чынам дабіліся такой чысціні і парадку?

— Не здзіўляйцеся, — але ўсё гэта робіць наш дзяжурны. Яго задачы не складаныя, але, разам з тым, не простыя: сачыць за парадкам, дастаўляць газеты і часопісы ў пакоі, прыбіраць на паверсе. Здаецца, нічога тут складанага, скажаце вы. А якія цяжкасці трэба было пераадолець нам, каб дабіцца гэтага! Галоўнае, што дапамагала — агульнае меркаванне аб неабходнасці дзяжурнага на паверсе. Тут мы пачалі думаць, як лепш арганізаваць дзяжурства, каб яно не перашкаджала вучобе, іншым справам студэнтаў. Спачатку прапанавалі дзяжурыць на паверсе толькі па 2 гадзіны. Але гэта сябе не апраўдала. Зараз дзяжураць па 3 чалавекі ў дзень. У старасты няма праблем з графікам. Ён прыходзіць у пакой і загадзя папярэджвае. А ўжо ў які час, хто будзе дзяжурным — гэта справа жыхароў пакоя. Яны дамаўляюцца між сабой. На інструктаж ходзяць усе без напамінаў. Цяпер думаем над тым, як арганізаваць дзяжурства такім чынам, каб яно не перашкаджала заняткам,— сказала на развітанне Ірына Баравік.

Зусім іншае давялося пабачыць у інтэрнаце № 2, дзе, як вядома, жывуць студэнты журфака і фізфака. Што здзівіла — усе студэнты, як дамовіўшыся, адказвалі ў адзін голас: «Такое дзяжурства, як у нас, нікому не патрэбна! Яно толькі адбірае дарагі кожнаму з нас час». Гэтая нешматслоўная размова са студэнтамі праз некалькі хвілін пацвердзілася.

Зноў прайшлі па ўсіх паверхах. Толькі на чатырох з іх былі дзяжурныя. Абклаліся кнігамі, газетамі, ім і спраў ніякіх да таго, што робіцца на паверсе, чысціня там ці бруд — ім усё адно.

— А што ўваходзіць у вашы абавязкі?

— Сядзець...

Вось такія дзяжурныя. А здавалася б, што іменна ў гэтым інтэрнаце справы павінны ісці лепш, чым дзе, бо тут нямала студэнтаў з розных краін. Яны павінны бачыць чысціню і парадак, асабліва ў будынку, які стаў для іх другім домам. А тут, на жаль, усё наадварот...

А вось што на гэты конт думае намеснік старшыні студэнцкага савета Андрэй Максімаў:

— Вучуся я на факультэце першы год, нядоўга і ў студэнцкім савеце. Але магу смела сказаць, што многа яшчэ недахопаў у рабоце студсавета. Возьмем толькі той факт, што пасяджэнні нашы праходзяць часта вельмі лёгка, гладка, ні ў каго ніякіх пытанняў ніколі не бывае.

Пытанне аб дзяжурстве ў інтэрнаце № 2 і дагэтуль — адно з нявырашаных. Над ім неабходна сур'ёзна паразважаць студэнцкаму савету.

**І. НЯРОШЧЫНА,**
старшыня прэс-цэнтра прафкома.

## ЗАЎТРА СПЕЦЫЯЛІСТ





Фота А. ВАЛОШЫНА.

### школай

**тэму, на лепшае сачыненне аб Жанне д'Арк.**

**У 10-х класах адбыўся вечар, прысвечаны 80-годдзю першай рускай рэвалюцыі, які падрыхтавалі студэнты Галіна Коршун і Пётр Дудзінскі. Сур'ёзна аднесліся вучні да напісання дакладаў. Гэты вечар, на нашу думку, не толькі пашырыў веды вучняў аб рэвалюцыі 1905—1907 гг., але садзейнічаў выхаванню ў іх патрыятызму, любві да Радзімы.**

**А Сяргей Бондараў і Людміла Клякшто падрыхтавалі вечар для дзевяцікласнікаў «За мір на ўсей планеце».**

**М. КОБЗА,**
студэнтка гістарычнага факультэта.

## НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

# ЦІХА! ІДЗЕ СЕСІЯ...

(Заканчэнне).

**Больш упэўнена адчуваў сябе яго сябра і камсорг групы Сяргей Кнацько:**

— Здаць на «выдатна» мне перашкодзіць толькі..,— і не знайшоў такой прычыны.

**Цікава, як жа будзе на самай справе адчуваць сябе Сяргей, калі штосьці не атрымаецца?**

**Праз 40 мінут Сяргей выйшаў ад экзаменатара спакойны і з «выдатна». Упэўненасць не падвяла яго!**

**Іра Шашылава, другакурсніца біялагічнага факультэта:**

— Калі ёсць дастатковы ўзровень самападрыхтоўкі, можна сарыентавацца ў любых абставінах. Галоўнае, лічу, трэба быць упэўненым у сваіх сілах. І нават баявым.

**У Іры Сапешка гэта сесія — першая:**

— Разумею, што першая сесія для нас важная іменна таму, што яна першая. Кожны марыць пра чырвоны дыплом, пяцёркі, лёгкія білеты. Але, на жаль, не ўсе мары збываюцца. Я не лічу трагедыяй, калі марыш пра «выдатна», а атрымліваеш «добра». Няўжо толькі адзнакай вымяраюцца нашы веды!

**А вось думка дэкана наконт сесіі. Гаворыць А. М. Шырокаў:**

— Вучыцца трэба па-сапраўднаму. Студэнты павінны шмат чытаць, вучыцца думаць, таму што перад кожным з іх жыццё паставіць пытанні ў свой час. А яно адзнакі ставіць па заслугах.

Вядома, хочацца, каб студэнты былі выхаванымі, разумнымі, сапраўднымі майстрамі сваёй справы. А яшчэ трэба, каб кожны студэнт пранікся да сябе павагай як да асобы.

Мы ж, выкладчыкі, стараемся быць справядлівымі арбітрамі...

**...Ціха! Ідзе сесія...**

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

# НА КРЫЛАХ СПАБОРНІЦТВА

ВЫТВОРЧАЯ КАМІСІЯ прафсаюзнага бюро кафедраў грамадскіх навук падвяла вынікі сацыялістычнага спаборніцтва.

У падрыхтоўку да XXVII з'езда КПСС у апошнім годзе адзінаццатай пяцігодкі значны уклад унеслі калектывы супрацоўнікаў і аспірантаў кафедраў грамадскіх навук. Дастаткова прывесці наступныя выніковыя лічбы. 30 працэнтаў дысертацый, якія абаранялі супрацоўнікі і аспіранты універсітэта, прадстаўлены кафедрамі грамадскіх навук. У 1985 годзе абаронены 2 дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара філасофскіх навук дацэнтамі А. А. Міхайлавым і А. М. Елсуковым. Грамадазнаўцамі апублікаваны 16 манаграфій, 253 навуковыя і метадычныя артыкулы, выданы 71 метадычная распрацоўка і вучэбны дапаможнік. Прачытана для насельніцтва 3218 лекцый, 40 студэнцкіх навуковых работ адзначаны ўзнагародамі.

Найбольш актыўна працавалі калектывы кафедраў марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, педагогікі, этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў. У 1985 годзе на базе кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму праведзена Усесаюзная канферэнцыя «Актуальныя праблемы маральнага выхавання студэнцкай моладзі».

Існуючая методыка падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва адрозніваецца ад агульнауніверсітэцкага палажэння і ўлічвае віды работ і спецыфіку дзейнасці калектываў грамадазнаўцаў.

Сацыялістычнае спаборніцтва выступае стымулам далейшага павышэння эфектыўнасці дзейнасці калектываў. У ходзе спаборніцтва і падвядзення яго вынікаў параўноўваюцца паказчыкі па розных відах работ. Кожная кафедра бачыць свае дасягненні і вызначае тыя ўчасткі дзейнасці, на якія патрэбна звярнуць большую ўвагу.

**А. СМАНЦЭР,**
дацэнт;
**А. ДУДКО,**
дацэнт,
**А. МІШУК,**
дацэнт.

**НА ЗДЫМКУ:** у час падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

**Фота А. ВАЛОШЫНА.**



**шала правілы паводзін у інтэрнаце і загад рэктара, не была пакарана. А калі ўсё добра абышлося адзін раз; чаму б і не паўтарыць?**

**На гэты раз не абышлося. На**

# ВЯЧЭРА

**пасяджэнні студэнцкага савета І. Іоннікава, С. Додзь, А. Панцялееў і І. Хамайко выселены з інтэрната, іх асабістыя справы будуць разгледжаны камітэтамі камсамола падрыхтоўчага аддзялення і філалагічнага факультэта. Не далі жадаемага выніку спробы Іоннікавай і Панцялеева ўвесці студсавет у зман. Зразумела, што аматарам выпіўкі не месца ў камсамоле і універсітэце.**

**Але хочацца спыніцца на дзвюх абставінах гэтай справы. Хаця студсавет і даў прынцыповую ацэнку дзеянням выпівох, у выступленнях некаторых удзельнікаў пасяджэння адчувалася недарэчная паблажлівасць: «за паўгода свядомасць чалавека не перабудуеш, на гэта патрэбна, як мінімум, гадоў 10». Прабачце, свядомасць якога чалавека? Бо размова ідзе аб асобах, якім няма і 21 года, якія наогул не маюць ніякага права нават спрабаваць спіртнога. І ім прапануецца даваць тое дзесяцігоддзе на перабудову свядомасці? Такі падыход ніяк не можа садзейнічаць усталяванню цвярозага жыцця ў маладзёжным студэнцкім асяроддзі.**

**І другое. Сам факт гэтай п'янкі стаў магчымым толькі дзякуючы дзіўнай пазіцыі камітэта камсамола і прафбюро філалагічнага факультэта, якія практычна пакінулі без пакарання І. Іоннікаву, што распівала спіртное яшчэ раней. Нам вельмі хацелася б пачуць адказ на пытанне, якім чынам гэта стала магчымым?**

**Шкада, не ўсіх студэнтаў прывяла ва універсітэт сцяжынка да ведаў. Для такіх, як Іоннікава, Додзь, студэнцкія гады — гэта вясёлае жыццё, п'янкі ў інтэрнаце, словам, безупынны кірмаш задавальненняў самага нізкага манеру. А новыя веды, здаецца, яны набываюць у вінаводачных аддзелах гастраномаў.**

**Патрэбна мараль? Маралі не будзе. Так як і не будзе універсітэцкіх дыпломаў ва ўсіх аматараў эксперыментальнага даследавання моцных напіткаў.**

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
старшыня штаба «КП» універсітэта.

## КЛУБ ЦІКАВЫХ СУСТРЭЧ

**На філалагічным факультэце стала добрай традыцыяй праводзіць цікавыя і змястоўныя сустрэчы з вядомымі дзеячамі культуры, пісьменнікамі і паэтамі. Не так даўно ў гасцях у студэнтаў-філолагаў былі І. Навуменка, Р. Барадулін, В. Адамчык, У. Някляеў, В. Іпатава, М. Стральцоў, Р. Баравікова.**

**Значэнне такіх мерапрыемстваў у маральна-этычным выхаванні студэнтаў цяжка пераацаніць: яны дапамагаюць будучым філолагам адчуць і зразумець цудадзейную сілу, хараство і веліч роднага слова, цаніць і паважаць духоўную культуру і гісторыю народа, тонка аналізаваць з'явы літаратурнага працэсу.**

# Аляксей Дудараў: «Я САМ НЯДАЎНА ЗДАВАЎ ЭКЗАМЕНЫ...»

НА ФІНІШЫ года, у якім усё прагрэсіўнае чалавецтва святкавала саракавую вясну Вялікай Перамогі, студэнты III курса аддзялення беларускай і рускай моў і літаратуры арганізавалі сустрэчу з вядомым беларускім драматургам Аляксеем Дударавым — лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі Ленінскага камсамола і Ленінскага камсамола Беларусі, уладальнікам спецыяльнага прыза фестывалю «Прыбалтыйская вясна».

...Адна з самых вялікіх аўдыторый факультэта не змагла змясціць усіх жадаючых. І гэта не дзіўна — цікавасць да творчасці маладога празаіка і драматурга сапраўды вялікая. За яго імклівым узлётам не паспявае нават крытыка. І хаця п'есы ставяцца ў вядучых тэатрах краіны, агульнавядомы поспех фільма «Белыя росы», створанага па яго сцэнарыю, кожнаму, каго цікавіць літаратура, хацелася чым



больш даведацца пра творы, убачыць і пачуць самога аўтара.

Вось чаму з вялікай цікавасцю, літаральна затаіўшы дыханне, прысутныя слухалі ўступнае слова выкладчыка кафедры беларускай літаратуры Любові Аляксандраўны Ламекі, якая ўзнёсла, пранікнёна расказала аб галоўным у творчасці А. Дударава — вострай пастаноўцы сацыяльных і маральна-этычных праблем, глыбіні спасціжэння тэмы подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, імкненні драматурга раскрыць духоўную і маральную прыгажосць сучаснага чалавека, глыбіню яго філасофскага роздуму аб сэнсе жыцця.

Яшчэ ў першых сваіх апавяданнях А. Дудараў ставіў пытанні аб маральным ідэале, духоўным і маральным фундаменце асобы ў сучасным свеце. Ён думае над тым, як захаваць у гэтым новым, цывілізаваным, уладкаваным жыцці тыя агульначалавечыя, гуманістычныя каштоўнасці працоўнай народнай маралі, якія, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, рабілі людзей людзьмі. Быць па-грамадзянску сумленным чалавекам — гэта няпроста: гэта не ўзнагарода, а цяжкае служэнне абавязку, уласнаму сумленню, у канчатковым выніку — грамадству і народу.

Усведамленне роднасці з зямлёй, як асновай і зарукай неўміручасці жыцця, з глыбокай мастацкай сілай выяўлена ў п'есе «Радавыя», адзначанай Дзяржаўнай прэміяй СССР. «Радавыя» — гэта памяць вайны, памяць-боль, памяць-сумленне, памяць-надзея. Неўміручае маральнае значэнне гэтай памяці — яна ўзвышае і ачышчае чалавека. Прайсці праз шалёны агонь вайны і захаваць душу жывую — ці не гэта самае галоўнае ў нашай Перамозе — думае разам з гледачом драматург А. Дудараў. І сцвярджае роўную адказнасць і роўны гонар барацьбы і перамогі кожнага салдата Вялікай Айчыннай.

Творчасць А. Дударава хвалюе нас пастаноўкай актуальных праблем, якія маюць вялікае значэнне ў паўсядзённым жыцці кожнага чалавека, яна вучыць сумленнасці, вернасці, самаадданасці, нарэшце, гераізму — усяму, што мы называем адным словам — чалавечнасць. І ў гэтым яе глыбокае сучаснае гучанне.

І вось перад прысутнымі сам аўтар «Парога», «Вечара», «Радавых». Падзякаваўшы за добрыя словы і глыбокі аналіз усяго, што выйшла з-пад яго пяра, Аляксей Дудараў сказаў: «Я сам быў нядаўна такім жа, як вы, сам вывучаў літаратуру, здаваў экзамены і залікі. І для мяне сённяшняе выступленне — таксама ў пэўным сэнсе экзамен. Хочацца, каб у нас атрымалася змястоўная размова аб тым, што цікавіць і вас, і мяне».

Размова адбылася, і хаця была яна сур'ёзная, знайшлося ў ёй месца і добраму жарту. Часам аўдыторыя зачаравана сціхала, а часам раздаваліся выбухі смеху і сапраўдны—інакш не скажаш — гром апладысментаў. Вельмі ж незвычайны быў госць — малады, сімпатычны, непаўторны ў міміцы і жэстах. Тут выявіўся, безумоўна, сцэнічны талент А. Дударава — ён у свой час закончыў акцёрскі факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Даведаліся прысутныя і аб тым, што нарадзіўся Аляксей Ануфрыевіч у сялянскай сям'і, бацька яго — франтавік, які прайшоў праз усю вайну і ўвесь яе цяжар адчуў на сваіх плячах. У біяграфіі А. Дударава ёсць і такі факт — ён закончыў Наваполацкае вучылішча нафтавікоў і атрымаў рабочы разрад, пра што гаварыў з гонарам.

Пачынаў пісаць ён з апавяданняў, замалёвак, якія пазней, калі нараджаліся п'есы, згадзіліся ў якасці «будаўнічага матэрыялу».

На драматурга вялікі ўплыў аказала творчасць Макаёнка, Вампілава, Быкава, работа з такім вядомым рэжысёрам, як Таўстаногаў.

Як нараджаюцца п'есы А. Дударава? Аказваецца, прататыпаў, у звычайным разуменні гэтага слова, у яго няма. Для аўтара важны нейкі асобны факт або падзея, якія даюць падставу для абагульнення.

Студэнты пачулі адказы на шматлікія свае пытанні, звязаныя з работай драматурга, яго біяграфіяй, пастаноўкамі п'ес у тэатрах Савецкага Саюза, сакрэтамі драматургічнага майстэрства. Сярод пытанняў былі: «Ці правільна разумее Вас крытыка?», «Чаму Вы, такі малады, напісалі п'есу аб праблемах адзінокай старасці?», «Ці згаджаецеся Вы з думкай аб уплыве на Вашу творчасць «Фіесты» Хэмінгуэя, «Жывога трупа» Талстога?» і інш.

Сустрэча мела вялікую карысць не толькі для студэнтаў, але і для самога драматурга, бо ён атрымаў магчымасць пачуць выступленні радавых Вялікай Айчыннай, дацэнтаў кафедры рускай савецкай літаратуры С. А. Лысенкі і В. А. Захаравай, своеасаблівую споведзь аб убачаным і перажытым імі на дарогах вайны.

А. Дудараў пачуў высокую ацэнку сваёй п'есы «Радавыя» ад людзей, маладосць якіх была апалена вайной, а таксама атрымаў канкрэтныя парады выкарыстаць у сваёй далейшай рабоце матэрыялы аб Вялікай Айчыннай вайне, аб мінскім падполлі, сабраных студэнтамі і выкладчыкамі філалагічнага факультэта.

У тым, што дыялог пісьменніка са студэнтамі і выкладчыкамі праходзіў у даверлівай, душэўнай атмасферы, значная заслуга вядучага сустрэчы — старшага куратара III курса Уладзіміра Барысавіча Ламекі, чыё ўменне тактоўна падтрымаць і накіраваць гутарку вядома па тэлечасопісу «Роднае слова».



На развітанне драматург пакінуў свой аўтограф.




**Г. ЮРЧАНКА,**
загадчык лінгафоннай лабараторыі філалагічнага факультэта.
**Фота Ю. ПЕЧУРА,**
студэнта філалагічнага факультэта.

# Мелодыя зімовага лесу

## ЭЦЮД

*ЗІМА... Прырода, скінуўшы з сябе вопратку лета, адпачывае ў белай задуменнасці і халодным спакоі. І як прыемна ў такі час пабываць у лесе. У гэтыя моманты забываецца ўсё самае прыкрае, непрыемнае. Ты ўліваешся ў адзіную сям'ю лесу і становішся яго маленькай часцінкай.*

*Бярозкі, быццам маладзенькія дзяўчаткі, сабраліся ў круг і аб нечым шапочуць. Мабыць, яны мараць аб вясне, аб жаданым часе, калі змогуць нарэшце апрануць свае новыя прыгожыя сукенкі. І калі незнарок сядзе на галінку птушка, бярозка пачынае хуценька-хуценька калыхацца. А іней павольна апускаецца на зямлю, быццам маленькія крышталікі злятаюць з галля, пераліваючыся на сонцы рознакаляровым святлом. Святлом зімы. Дрэва на хвілінку «размінаецца» пасля белага глыбокага сну, выпроствае свае «рукі». Пасля зноў засынае.*

*А вось стары дуб аднолькава абыякава адносіцца да ўсяго, што адбываецца вакол яго. Стаіць у загадкавай таямнічасці. Думае нешта сваё. Можа ён успамінае пра тое, як быў калісьці маладым, як пад яго магутнай зялёнай кронай знаходзілі прытулак у гарачы спякотны час многія лясныя звяры, птушкі.*

*Дрэвы, як і людзі, з іх непаўторнымі характарамі, могуць і перажываць, і хвалявацца, і сумаваць.*

*Ёлкі і іх сястрычкі-сосны нейкім чынам вызваліліся ад снегу. І цяпер радуюць сваім убраннем, аднолькавым летам і зімой, але такім прыгожым. Калі глянуць на гэтыя дрэвы знізу ўверх, то ўзнікае ўражанне, быццам паветраны зялёны дыван павіс над зямлёй, павіс і зараз упадзе плаўна на пушысты мяккі снег, параніўшы яго.*

*Усё ў зімовым лесе такое цудоўнае, таямнічае, быццам у казцы. Нават ёсць свая музыка, пяшчотная і пяшчотная, музыка лесу, якой так не хапае нам у гарадской мітусні.*

*Алена БАЧУК,*
*студэнтка факультэта журналістыкі.*
*Фотаэцюд А. ВАЛОШЫНА.*



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

23 студзеня 1986 г.
Зак. 96. АТ 07047

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.